прозвішча, імя і імя па бацьку. Магчыма, героі гэтых твораў маюць уласнае імя таму, што Вялікая Айчынная вайна і чарнобыльская трагедыя перажыты асабіста многімі беларусамі, падзеі адбыліся тут, на роднай зямлі. Афганская вайна была «чужой і далёкай», але не менш трагічнай. Пранізліва гучыць голас Яны Чэрнікавай, дванаццацігадовай дзяўчынкі, гераіні кнігі «Апошнія сведкі». Дзеці хутка сталелі, станавіліся дарослымі. Тэма «страчанага дзяцінства» гучыць у С. Алексіевіч асабліва пранізліва: «С куклами я тоже рассталась. Мама потеряла месячные хлебные карточки, мы погибли буквально. И мне пришла в голову спасительная идея: попробовать обменять на что-нибудь мои две куклы — большую и маленькую. Отправились с ними на базар. Подошел старый узбек: “Сколько стоит?” Мы сказали, что нам надо прожить месяц, у нас нет карточек. Старый узбек дал нам пуд риса. И мы не умерли с голода. Мама поклялась: “Я куплю тебе этих кукол, как только мы вернемся домой”. Когда мы вернулись в Ростов, она не сумела их мне купить, мы снова нуждались. Она купила их мне в день окончания института. Принесла большую и маленькую куклы… » [19, с. 105].

**Заключэнне.** Стварэнне вобразаў літаратурных герояў у прозе С. Алексіевіч вызначаецца дакументальна-мастацкай асновай. Героі яе кніг — рэальныя людзі, якія распавядаюць пра сваё жыццё. Адсутнасць некаторых тыповых мастацкіх характарыстык героя (напрыклад, партрэта) ускладняе магчымасць традыцыйнага аналізу вобразаў. Героі апавядаюць ад першай асобы, яны не падаюць дакладныя звесткі пра сябе, часам расказваюць пра знаёмых, блізкіх сяброў, якіх напаткала бяда. С. Алексіевіч піша ў жанры дакументальна-мастацкай літаратуры, таму яна не можа «дапрацоўваць» сваіх герояў, гэта, аднак, не перашкаджае чытачу ўбачыць рэалістычны вобраз чалавека, яго асабістую бяду. Калектыўны голас народа, складзены з мноства адзінкавых споведзей, гучыць як рэквіем па ахвярах трагічных падзей XX ст.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мн. : БэлСЭ, 1986. Т. 3. 751 с.
2. Там жа. С. 275.
3. Там жа.
4. Сону С. Светлана Алексиевич. «Чернобыльская молитва: хроника будущего» [Электронный ресурс] // Интернет-журнал молодых писателей России. URL: http://www.ijp.ru/razd/pr.php (дата обращения: 10.09.2015).
5. Там же.
6. Алексиевич С. Цинковые мальчики. Зачарованные смертью. Чернобыльская молитва (хроника будущего). М. : Остожье, 1998. 608 с.
7. Сивакова Н. Особенности субъективной организации документальных книг С. Алексиевич // Вестн. ТвГУ. Сер. Филология. 2014. № 3. С. 134—139.
8. Сивакова Н. Особенности субъективной организации документальных книг С. Алексиевич. С. 21.
9. Там же.
10. Там же. С. 25.
11. Там же.
12. Там же. С. 29.
13. Там же. С. 40.
14. Там же. С. 29.
15. Там же. С. 41.
16. Там же. С. 31—32.
17. Бельскі А. Выпрабаванне смерцю і чалавечнасцю. Вайна ў Афганістане і літаратуры // Род. слова. 1990. № 7. С. 22—26.
18. Сивакова Н. Особенности субъективной организации документальных книг С. Алексиевич. С. 139.
19. Алексиевич С. Последние свидетели: книга недетских рассказов. М. : Молодая гвардия, 1985. 175 с.


**УДК 821.161.3(035.3)**

**М. С. Ліс**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ВОБРАЗ ВУЧОНАГА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ «ЭПОХІ РУБЯЖА»

**Уводзіны.** Мастацкі характар — гэта вобраз чалавека ў літаратурным творы, акрэслены з пэўнай паўнатой і індывідуальнай вызначанасцю, які раскрываецца як гістарычна абумоўлены тып паводзін (учынкі, думкі, перажыванні, мова), так і ўласцівая аўтару маральна-эстэтычная канцэпцыя чалавечага існавання. У беларускай прозе першай трэці XX ст. («эпохі рубяжа») створана цэлая галерэя мастацкіх характараў і тыпаў. У першую чаргу яны прад’яўлены як пэўныя сацыяльныя тыпы, што ўвогуле ўласціва для пераходных перыядаў.

© Ліс М. С., 2016

**Асноўная частка.** Найбольш распаўсюджаны вобраз-характар у беларускай літаратуры — гэта вобраз простага селяніна, мужыка. Але разам з ім у эпічнае дзеянне з пачаткам новага ХХ ст. актыўна ўключаюцца і адукаваныя, «вучоныя» героі. Паводле сваёй сялянскай сутнасці, простыя героі беларускай прозы выяўляюць пэўны недавер да людзей адукаваных, а адпаведна, прыналежных да іншых сацыяльных груп. Галоўная прычына заключалася ў тым, што самы першы адукаваны чалавек, з якім сутыкаўся селянін у сваім жыцці, быў дробны чыноўнік, той жа пісар, вельмі часта хабарнік, пазбаўлены спрадвечных маральных прынцыпаў, якія фарміравала вёска. Гэта адбілася ў змесце і форме мастацкіх твораў, адметнасці іх загалоўкаў, сродках стварэння вобразаў, дзе значнае месца займае алегорыя. Так, у апавяданні «Вучоны бык» Ядвігін Ш. расказвае пра селяніна Язэпа, які пайшоў прадаваць свайго бычка. Па дарозе яму сустрэліся салдаты і ўгаварылі селяніна аддаць бычка на навуку. Праз год Язэп вярнуўся па бычка, а салдаты адправілі яго да пана, сказаўшы, што гэта яго Падласы. У гэтым сатырычным апавяданні выяўляецца адмоўнае стаўленне сялянства да чыноўнікаў. Гэта праяўляецца ў наступным: «Дагадзіць яму не маглі патрапіць, перабраўся ён цяпер на сваю кватэру і, чутно, папаў у вялікія чыноўнікі. — Пакажыце тыкеля, — просіць Язэп, — дзе ён жыве, а я ўжо сам дам рады — нябось, пастронкі моцныя ўзяў» [1, с. 22—23]. У апавяданні У. Галубка «Адукаваная кабыла» азначэнні «адукаваная» і «гультаяватая» сінанімічныя [2, с. 22]. Гэта яскрава відаць у наступных радках: «Вяртаючыся з поля ўвечар на адпачынак, яна нудна глядзела ў той бок, адкуль яе прыгнаў новы гаспадар… Бывала — аўса ўволю, дагляд, працы ніякай, гарцуй сабе пад музыку, а тут мерай з канца ў канец даўгі шнур на полі» [3, с. 535]. Лічылася, што чым вышэй вучонасць чалавека, тым большы яго адрыў ад «роднага карэння». Гэта яскрава паказана З. Бядулем у апавяданні «На Каляды к сыну». Сумненні ў асабовай перавазе вучоных людзей над вясковымі гаспадарамі выказвае ў аповесці Л. Калюгі «Ні госць, ні гаспадар» Ігналя Чвардоўскі. «Што вучоны? Добра — дык пан, не раўня нашаму брату. Спракудзіўся ж у чым крыху — дык і пастух» [4, с. 90]. Многае вызначаў і факт «донарства», далучэнне «краёвай» інтэлігенцыі да пануючай культуры як духоўная здрада свайму народу, таму самаму «роднаму карэнню». М. Гарэцкі адным з першых у беларускай літаратуры загаварыў пра неабходнасць беражлівага стаўлення з боку народа, працоўнага сялянства да нацыянальнай інтэлігенцыі, якой не стае імунітэту, яшчэ бракуе ўнутранай здольнасці супрацьстаяць небяспечным ідэйным уплывам [5, с. 383].

У беларускай прозе першай трэці ХХ ст. па аб’ектыўных прычынах яшчэ не быў створаны паўнакроўны вобраз вучонага, але можна прасачыць подступы да стварэння яго канцэпцыі. Беднасць і гістарычна абумоўленая няздольнасць узняцца над будзённымі патрэбамі перашкаджалі беларусам асэнсаваць надасабовы і пазачасавы змест дзейнасці вучонага.

Падобная тэндэнцыя мела месца і ў рускай літаратуры, што можна сцвярджаць на прыкладзе апавядання А. Платонава «Усомнившийся Макар» [6]. «Нармальны мужык» Макар Ганушкін сасніў сон, у якім убачыў «навуковага чалавека». Да яго ў Макара ўзнікла пытанне: «Што мне рабіць у жыцці, каб я сабе і іншым быў патрэбен?» (тут і далей пераклад цытат на беларускую мову наш. — ***М. Л.***). Але «навуковы чалавек» стаяў і маўчаў. Ён не бачыў пакут Макара і думаў «толькі аб цэласным маштабе, а не аб прыватным». «Аблічча “найвучонейшага чалавека” было асветлена зарывам далёкага масавага жыцця, што рассцілалася пад ім удалечыні, а вочы былі страшныя і мёртвыя ад знаходжання на вышыні і занадта далёкага позірку». Калі Макар «далез да найвучонейшага» і крануў яго грамознае тоўстае цела, яно «варухнулася, як жывое, і адразу рухнула на Макара, таму што было мёртвае». Гэта надзвычай ёмкі і моцны па сваёй эмацыянальнай крытычнай сіле сімвал абстрактных ведаў, якім «прыносяцца ў ахвяру ўсе іншыя здольнасці душы, што забяспечваюць натуральную паўнату ўспрымання свету… пачуццё, інтуіцыя, фантазія, сэрца…» [7, с. 142].

У апавяданні «Стары прафесар» М. Гарэцкі акрэслівае вобраз героя, у жыцці якога ёсць месца разнастайным пачуццям. Ён моцна кахае сваю маладую жонку Вольгу, прыязна ставіцца да сялян: «Усіх людзей любіў. Да сялян быў ласкавы, даступны, сам падыходзіў і пытаўся пра іхняе жыццё. І любіў слухаць усё, што яму кажуць» [8, с. 45]. Але раптам яго жонка захварэла на якуюсь цяжкую і цягучую хваробу. Стары прафесар быў у роспачы, ён нават моцна змяніўся з выгляду: «Схудзеў прафесар, аблахмаціўся, вочы ў яго ўваліліся, гаруе бедны, як не плача пры людзях» [9]. Але скарыстацца народнымі сродкамі вучоны катэгарычна не пагаджаўся. Нават калі жонка прафесара захварэла, ён не хацеў прызнаваць ніякіх метадаў лячэння і давяраў толькі ўрачам: «Хадзілі да яго і нашы бабы-шаптухі са сваімі радамі, ды ён і слухаць іх не хацеў…» [10].

Ён выклікаў тэлеграмай з Пецярбурга найлепшага доктара. Той прыехаў, «пастукаў, паслухаў, паківаў галавою... ды і развёў рукамі таксама, як і тутэйшыя дактары: няма надзеі» [11].

Пастух параіў: «Абвязаць хворую сырою ніткаю і кінуць тую нітку на раздарожжы, каб зняла хваробу. Старая пані прасіла прафесара паслухаць, калі яму дарага Вольгачка. Але прафесар загневаўся: — Я чалавек навучны, а вы мне дурніну такую кажаце. ...І вось прафесар паказаў сваё каменнае навучнае сэрца. Гаворыць так: — Навука сказала свае слова, і я веру ёй, а не вашым забабонам» [12].

Тыя, хто акружаў прафесара, не маглі зразумець яго разваг: «…навука вышэй за цябе [Вольгачка], навука вышэй за ўсё, і без навукі мне было б нудна нават з табою… І ты памрэш, і я памру, а навука не павінна памерці і здрады не павінна цярпець» [13]. Прафесар лічыць, што калі ён дазволіць лячыць сваю жонку народнымі сродкамі, то здрадзіць навуцы: «Тут, — кажа, — справа не ў нітцы і не ў забабонах, а ў здрадзе навуцы, якую любіў, калі яшчэ і Вольгачкі не любіў…» [14]. Усё ж такі ён

зрабіў так, як гаварылі сяляне. Для аўтара галоўнае тое, што ў выніку напружанай унутранай барацьбы перамагае ўсё ж такі сэрца, а не розум: «Пляваць мне на цябе, навука, калі ты бяссільна!» [15].

Канцэпцыю вобраза вучонага ўдакладніў і развіў у сваім рамане «Праз гады» П. Галавач, досыць шырока паказаўшы навуковае асяроддзе ў дарэвалюцыйны час і гады сацыялістычнага будаўніцтва. Супастаўленне светапогляду і лёсаў двух прафесараў, славянафіла-манархіста Пілацеева і дэмакрата Галынскага, дазволіла пісьменніку, паставіўшы вострыя пытанні, даць адказы на многія з іх.

**Заключэнне.** У беларускай прозе першай трэці ХХ ст. створаны шэраг мастацкіх характараў і тыпаў, якія адпавядаюць тагачаснай сацыяльнай іерархіі. Найбольш распаўсюджаны вобраз-характар — гэта просты селянін. Разам з ім у эпічнае дзеянне ўключаюцца і адукаваныя, «вучоныя» героі, да якіх сялянства выяўляе пэўны недавер, абумоўлены адносінамі да пераважнай большасці чыноўніцтва. Эпітэты «вучоны», «адукаваны» часта нясуць адбітак іроніі, маркіруюць алегарычныя вобразы, створаныя ў фальклорнай традыцыі. Недавер меў і тую прычыну, што простыя людзі не разумелі сутнасці занятку вучоных. Першыя спробы абмалёўкі іх вобразаў — гэта сімвалізацыя абстрактных ведаў, якія нібыта не здольны забяспечыць паўнату ўспрымання свету, пачуцці, фантазію (А. Платонаў). М. Гарэцкі акрэсліў вобраз старога прафесара, які спачатку кіруецца выключна аргументамі розуму, але ў выніку асабістай трагедыі пачынае асэнсоўваць і каштоўнасць сардэчных пачуццяў. Амбівалентнасць, супярэчлівасць вобраза вучонага ў паказе М. Гарэцкага засведчыла наватарства ў падыходзе да абмалёўкі гэтага вобраза як прадстаўніка сацыяльна аформленай прафесіі.

### Спіс цытаваных крыніц


1. Ядвігін Ш. Выбраныя творы. Мн. : Маст. літ., 1976. 410 с.
2. Белая А. І. Герой. Асоба. Характар : Мастацкая персаналогія ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя : манагр. Баранавічы : РВА БарДУ, 2012. 517 с.
3. Гарэцкі М. Прысады жыцця : апавяданні, аповесці. Мн. : Маст. літ., 2003. 479 с.
4. Калюга Л. Творы: раман, аповесці, апавяданні, лісты. Мн. : Маст. літ., 1992. 607 с.
5. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі ; Ін-т літ. імя Я. Купалы. Мн. : Беларус. навука, 1999. Т. 1. 583 с.
6. Платонов А. Усомнившийся Макар [Электронный ресурс]. URL: http://magazines.russ.ru/october/2004/5/plat11.html (дата обращения: 24.09.2015).
7. Бальбуров Э. А. Русская философская проза: вопросы поэтики. М. : Яз. славян. культуры, 2010. 216 с.
8. Галубок У. Творы: драматургія, паэзія, проза, публіцыстыка. Мн. : Маст. літ., 1983. 607 с.
9. Там жа. С. 46.
10. Там жа.
11. Там жа.
12. Там жа. С. 47.
13. Там жа. С. 48.
14. Там жа. С. 49.
15. Там жа.


**УДК 82-31 Рублеўская**

**І. М. Мандрыкава**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ПРЫГОДНІЦКІЯ РАМАНЫ Л. РУБЛЕЎСКАЙ: ПРАБЛЕМА ЖАНРУ

**Уводзіны.** Шматграннасць — гэтае слова найлепш характарызуе асобу Л. Рублеўскай, якая выступае ў літаратуры як паэт, празаік, драматург, крытык. Яна працуе амаль ва ўсіх галінах літаратурна-мастацкай творчасці і мае прыкметны плён у сучаснай беларускай літаратуры.

Да творчасці Л. Рублеўскай звярнуліся такія літаратуразнаўцы, як Л. Алейнік, Г. Зенава, Т. Кабржыцкая, А. Бельскі, К. Кушнарова і інш. Аб’ектам іх даследаванняў былі «Жаночы свет у люстэрку “малой прозы”: творчыя пошукі Л. Рублеўскай і Г. Багданавай», «Роля часу ў арганізацыі мастацкага цэлага», «Жанравая спецыфіка прозы Л. Рублеўскай» і інш. Праблема жанру твораў Л. Рублеўскай патрабуе далейшай навуковай распрацоўкі. Метады даследавання заснаваны на гісторыка-літаратурным і параўнальна-супастаўляльным падыходах да вывучаемага матэрыялу.

**Асноўная частка.** Жанр прыгодніцкай літаратуры сфарміраваўся ў сярэдзіне XIX ст. Папярэднічалі яму такія літаратурныя плыні ў еўрапейскай культуры, як рамантызм і неарамантызм, народжаныя прагай экзотыкі і яркіх пачуццяў у процівагу шэрай мяшчанскай будзённасці [1, с. 78]. Галоўныя рысы прыгодніцкага рамана — выразнае дзяленне персанажаў на герояў і зладзеяў, імклівае

© Мандрыкава І. М., 2016